Год I. Пятніца, 9 сьнежня (26 наябра) 1921 г. № 12—13

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месяцы 400 польскіх марак. За граніцай ў два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак.

Паведамленьне.

Прафэсыянальны саюз рабочых безьзямельных і малазямельных Сярэдней Літвы склікае на 26 сьнежня зьезд у Вільні прадстаўнікоў безьзямяльных і малаземельных сялян Сярэдняй Літвы.

Кожная вёска і маёнтак мае права паслаць па два прадстаўнікі, а калоніі Ізраільскіх рабочых і фальваркі па аднаму. Прадстаўнікі павінны мець з сабою адпісы пратаколаў і ежы на два дні. Зьяўляцца павінны загадзя у канцэлярыю Саюза (Вільня, Віленская вул. № 12). На зьездзе будуць разглядацца гэткія пытаньні: 1) Справаздача кіраўніцтва саюза. 2) Выбары цэнтральнага бюро, 3) Бягучыя справы.

Кіраўніцтва Саюза.

СОЙМ СКЛІКАЕЦЦА...

Пасьля неаднаразовых адкладаў апублікаваньня дэкрэту аб скліканьні Сойму ў Вільні, некалькі дзён таму назад дэкрэт зьявіўся. Выбары у Сойм адбудуцца 8 студня (январа) 1922 г., г. ё. праз месяц.

Зусім мала часу аддзяляе нас ад мамэнту выбараў у Сойм і гэта *вельмі важна для нас.* Яшчэ-ж важней тое, што *сьпісы кандыдатаў у Сойм трэба падаваць не пазьней 22 сьнежня* (дзекабра). Значыцца, для таго, каб с'арганізавацца і падаць свае сьпісы кандыдатаў у Сойм, *астаецца якіх-небудзь 12 дзён.*

Усякі разумее, што каб скласьці сьпіс кандыдатаў, трэба склікаць сходы, зьбіраць зьезды, знаёміцца з людзьмі і іх настроямі і г. д., бо *далека ня усе нашыя людзі добра разумеюць, што цяпер дзеецца навокала іх і нашто склікаецца у Вільні Сойм.*

Беларусы, як і іншыя нацыянальныя адзінкі нашага краю, каторыя трактуюцца сучаснаю уладаю, як меншасьці, *у працягу больш году маўчалі, палітычна замерлі,* тады як *палякі,* а сярод іх—вядомыя чарнасоценныя партыі,—праз увесь час *свабодна арганізовываліся і разьвівалі сваю працу без памехі і канкурэнцыі* з боку „меншасьцяў", у тым ліку і з боку беларусаў. Дзякуючы гэтаму, мы цяпер бачым, што *падгатаванымі да выбараў у Сойм зьяўляюцца толькі палякі. У іх руках усе козыры:* і папярэдняя, — больш як у працягу году, — падгатоўка да Сойму, пры поўнай немагчымасьці якой-небудзь свабоднай палітычнай агітацыі для іншых нацыянальнасьцяў нашага краю, і тое, што ўся заканадаўчая і выканаўчая ўлада знаходзіцца выключна у польскіх руках, і тое, што палякі маюць у сваім распараджэньні вялізарныя сумы грошаў з Варшавы...

А мы што маем?

— *Разьбітыя надзеі на абяцаныя „вольнасьці і роўнасьці",* ніякіх правоў і гарантыяў на тое, каб жыць нам не пад гнётам няволі, ігнараваньне нас, як краёвага элемэнту, пры назначэньні на розныя пасады, або пры „выбарах у самажонды", *заўзятую барацьбу з беларускай школай,* а над усім гэтым—*цемру і беднасьць беларускага сялянства,* нядоля якога ў сучасны мамэнт ўзывае да неба.

Начальнік Польскай дзяржавы Я. Пілсудзкі, зьвярнуўся больш як два гады таму назад з прыгожаю адозваю да жыхароў нашага краю, абяцаючы нам вызваленьне з пад чужацкай няволі і будову нашага жыцьця на асновах „вольныя з вольнымі і роўныя з роўнымі". Нядаўна Я. Пілсудзкі сказаў у Варшаўскім Сойме, што ня можна вырашаць справу аб прыналежнасьці нашага краю сілаю аружжа, а трэба выслухаць голас народу праз выбраны ім Віленскі Сойм. *Якія-ж гарантыі таго, што склікаемы Сойм зьявіцца голасам усяго народу,* а ня толькі штучна разагітаванай „пад польскасьць" часьці яго якія гарантыі у нас ёсьць? Як мы ужо бачылі раней, такіх гарантыяў няма.. „Голас народу" пры сучасных варунках і спосабах яго выяўленьня ня можа быць свабодным і роўным для усіх. Свайго голасу мы, беларусы, ня зможам цяпер падаць хоць бы таму, што няма калі гэта палюдзку зрабіць, а рабіць як-небудзь, без падгатоўкі, мы ня можам і пратэстуем проціў нарушэньня нашых правоў.

У такі „прысьпешаны" Сойм ісьці нам няма чаго, бо для нас усе дарогі зачынены „мудрай" палітыкай апошняга году. Няхай ідуць „падгатаваныя", а мы пачзівімся, пацерпім...

ШТО ЧУВАЦЬ У СЬВЕЦЕ?

Кітай і Японія.

З Вашынгтонскай канфэрэнцыі паведамляюць, што на прапазыцыю Хюгса (Амэрыка) і Бальфура (Англія) — Кітай і Японія згодзіліся скончыць спрэчку аб Шантуне і Кяо-Чао палюбоўна.

Бальшавікі аб Вашынгтонскай Канфэрэнцыі.

Бальшавіцкія газэты войстра крытыкуюць Вашынгтонскую канфэрэнцыю, кажучы, што яна нічога ня зробіць без Нямеччыны і Расеі. Каб унікнуць новае вайны, трэба склікаць канфэрэнцыю ўсіх дзяржаў.

Аўстрыя.

У Вене былі вялізныя непарадкі, меўшыя бальшавіцкі характар. Страты зьлічаюцца міліярдамі. Арыштавана 400 чалавек. Есьць цяжка раненыя. Цяпер наступіў спакой, бастуюць толькі камуністы.

Францыя.

Францыя адмовілася на Вашынгтонскай канфэрэнцыі зьмяншаць сваю армію дзеля боязьні Нямеччыны і Расеі.

Японія і Расея.

З Масквы паведамляюць, што расейска-японскія перагаворы ідуць добрым ладам. У зьвязку з гэтым японскі ўрад высяляе Крупенскага, быўшага царскага пасла.

Безрабоцьце у Англіі.

Лік безработных у Англіі дайшоў да 850,000 чалавек.

Зялезна-дарожны рух Менск—Варшава.

ВАРШАВА 28—XI—1921 г. (Славбюро). У Стоўпцах пачалася нарада расейскіх і польскіх дэлегатаў аб наладжаньні простага чыгуначнага пасажырскага і таварнага руху Менск—Варшава.

Прыватны вольны гандаль у Расеі.

ГДАНСК, 28—XI—1921 г. (Славбюро) Некаторыя Гданскія фірмы дасталі запытаньні расейскіх фірмаў з Масквы, Менску і Смаленску на хімічныя і аптэкарскія тавары.

Новая хвароба.

ЛЬВОЎ, 1—XII—1921 г. (Славбюро). На Валыні зьявілася новая пошасная хвароба, падобная да жаўтухі, якую прынясьлі ўцекачы.

Курс нямецкай маркі ў Расеі.

ГДАНСК, 28—XI—1921 г. (Славбюро). Курс нямецкай маркі ў Маскве 600 савецкіх рублёў за марку.

Ангельска-ірляндзкая згода.

Па астатніх ведамасьцях перагаворы Лойд-Джорджа з сінфэйнэрамі скончыліся згодаю між Англіяй і Ірляндыяй.

Вашынгтонская канфэрэнцыя.

ЛЕНДАН, 7 сьнежня (А В). Вашынгтонская канфэрэнцыя ня зробіць важных пастаноў да канца цякучага месяца. Чакаюць прыезду Лойд-Джорджа, каторы скажа аб разаружэньні.

Нямеччына.

БЭРЛІН, 7 сьнежня (Пат). Учора ізноў пачаліся непарадкі пры. чым разьбіваліся склады.

БЕЛАРУСЬ пад МАСКОЎШЧЫНАЙ.

(Па ведамасьцях менскіх газэт).

Русіфікатары.

Вітабская пачтова-тэлеграфная кантора адмовілася прыняць афіцыяльную тэлеграму ад Вітабскага Археолёгічнага Інстытуту ў Менск на імя Рэктара Беларускага Унівэрсытэту з прывітаньнем і пажаданьнем Унівэрсытэту творчай працы сярод адраджаючагася беларускага народу.

Лекцыі беларусазнаўства ў Вітабску.

У Вітабскім Археолёгічным Інстытуце М. В Мялешка пачаў выкладаць беларускую літэратуру і яе гісторыю. 5 верасьня ім быў зроблен першы даклад на тэму „Нараджэньне і разьвіцьцё беларускай літэратуры" — пры поўнай аудыторыі. Дакладчык прычыны, якія выклікалі да жыцьця беларускую літэратуру, засноўвае на даўнейшай нашай высокай пісьменнасьці, на ідэях філёзофіі XVII в. і на палітычных і гістарычных варунках канца XVIII і пачатку XIX в. в.

Неўзабаве Ан. Шлюбскі ў гэтым жа Інстытуце мае прачытаць рад дакладаў па беларускай этнаграфіі.

Беларуская справа ў Магілеўшчыне

Прайшло тры гады, як лепшая моладзь Магілеўшчыны у месьце Магілеве залажыла культурна-асьветны гурток „Асьвета". Доўгі час праца насіла характар пачынальны, бо сябры, атрымаўшыя ў насьледак вядомую загнанасьць, былі няпеўны ў сваёй працы. Разам з гэтым на іх не пераставілі глядзець, як на людзей, што заместа высокага разьвіцьця нясуць нешта мужыцкае. Нядаўна папоўнены і адноўлены Гурток адкінуў проч ад сябе усякую няпеўнасьць і пільна прыступіўся да працы. Стараньнем Гуртка арганізавана беларуская трупа і хор, якія дужа добра пачынаюць весьці сваю справу. З вялікаю прыемнасьцю глядзіць працоўны народ на сваё роднае мастацтва. Зусім інакш, вядома, глядзяць ворагі працоўнага народу і „людзі панскага пагляду". Цяпер Гуртком адчынена пры Аддзеле Асьветы беларуская сэкцыя, якая павінна будзе супольна з гуртком разьвіваць пачатую работу. Сябрамі гуртка даўно ўжо было пацемлена адчыніць пры Магілеўскім Аддзеле Народнае Асьветы ці пад'аддзел ці хоць сэкцыю, але цяжка было да гэтай пары атрымаць згоду мястовага Аддзелу Асьветы. Апошнім часам добра наладжываецца сувязь са ўсімі Гурткамі Магілеўшчыны. З гутарак з іх прадстаўнікамі відаць, што праца там ідзе. Відзячы агулям адраджэнье Магілеўшчыны, Гурток мае ў думцы, што блізка тая часіна, калі Магілеўшчына скажа бацьку — Менску: „Забяры мяне ў сваю сям'ю".

Сябар Магілеўскага Гуртка
Бабарэчык.

Рэвізія.

Пры рэвізіі камуністычнае партыі па Гомельскай губэрні ў Быхаўскім павеце выдалена з партыі 45% у Клімавіцкім пав. 21%.

Савецкая Беларусь.

Падвышэньне вытворнасьці.

У Бабруйскім павеце шкляныя гуты і дрэваабрабляючыя фабрыкі падняла вытвор да нормы мірнага часу.

На некаторых лесапільнях вытворнасьць перабольшыла да-ваенную.

Шкляная гута „Клуша" падняла свой вытвор вышэй за нормы да-ваеннага часу пры тым самым ліку работнікаў.

Бабруйская гаспадарственая маслабойня выганяе 20 тысяч пудоў у месяц. („Новый мир").

Адбудова краю,

У Слуцкім павеце робіцца пільная адбудова разбуранага пры польскай акупацыі краю. Адбудована ўжо 80 проц. мастоў. Заканчываецца рэмонт грамадзкіх будынкаў. („Новый мир").

Чырвоная дошка.

ПРАГА. 28. XI—21 г. (Славбюро). Радыо з Масквы паведамляе: Сельскія рады пяцёх вёсак Асавецкай вол. Бабруйскага павета запісаны на чырвонай дошцы за пільны клопат у справе зьбіраньня продпадатку і за ўсьпешнае змаганьне з бандытызмам.

Новыя сельскія саветы.

У савецкай Беларусі адбываюцца перавыбары саветаў, з 15-га лістапада ідуць перавыбары сельскіх саветаў.

Газэта „Белорусская деревня" (№ 62 ад 11 лістапада), якая выходзіць у Менску, ў перадавым артыкуле піша: „Уся дзеяльнасьць новых сельскіх саветаў павінна будзе скіравацца на сельскую гаспадарку".

Сярод агітацыйных заклікаў той-жа газэты ёсьць такія, складзеныя буйнымі літэрамі; „Хай займуць месца ў саветах лепшыя людзі вёскі — гаспадары-практыкі, вучыцялі, каапэратары, звольненыя чырвонаармейцы і ўсе сьвядомыя грамадзяне. Яны як належыцца наладзяць сялянскае жыцьцё і сельскую гаспадарку". — „Сяляне! Вы не хочаце, каб вас крыўдзілі розныя нягоднікі, што прымазаліся да савецкай улады? Дык выбірайце ў сельскія і валасныя саветы сумленных, аддайных савецкай ўладзе людзей".

III-ці усебеларускі зьезд саветаў.

Трэці Усебеларускі Зьезд Саветаў склікаецца на 10 сьнежня (дзекабра) 1921 году.

Газэта „Савецкая Беларусь".

Вялікую штодзенную газэту на беларускай мове „Савецкую Беларусь", якая выходзіць у Менску, падпісуець цяпер, як адказны рэдактар, У. Ігнатоўскі — вядомы беларускі прафэсар і грамадзкі дзеяч. Газэта стаіць на варце культурных інтарэсаў Беларусі.

Паэты Я. Журба і А. Гурло — жывы.

У № 368 „Савецкай Беларусі" зьмешчана некалькі новых вершаў паэта Я. Журбы, а ў N 367 — два новых вершы паэта А. Гурло. З гэтага відаць, што абодва паэты, вядомыя ў беларускай літэратуры з часоў „Нашае Нівы", за вайну і рэвалюцыю ня згінулі і толькі доўга не падавалі голасу з невядомай чужыны.

Чарвякоў — на сваей пасадзе.

З менскіх савецкіх газет відаць, што старшыня Савету Народных Камісараў Беларусі Аляксандар Чарвякоў займае сваю пасаду, і весткі некаторых віленскіх газет, быццам ён па загаду з Масквы скінуты, аказаліся няпраўдзівымі.

Паўстанчы рух на Беларусі.

„Волынское Слово" (№ 105) піша:

Па ведамасьцях бальшавіцкіх газэт, паўстанчы рух на Беларусі з кожным днём разьвіваецца і захоплівае новыя паветы.

Беларусь, як і Украіна, па словах бальшавіцкіх газэт, робіцца дзялянскаю унутранага фронту.

Чырвоныя войскі, кватэруючыя ў Беларусі, выдзеляны ў асобную адміністратыўную адзінку. Прастор падзелен на баявыя дзялянкі, вайсковыя часткі выстаўляюць ахранную варту і высылаюць старожу. Змаганьне з бальшавікамі выглядае ў Беларусі, як і скрозь: напад на аддзелы, разбурэньне транспарту, часовае захопліваньне местаў, разьбіваньне складаў і зьніштажэньне бальшавіцкай бюракратыі.

Самыя буйныя партызанскія аддзелы арудуюць пад кіраўніцтвам Галака, — каторы зьніштожыў гарнізон м. Казельца і навёў жудасны упад на чырвоную ўладу ў Рэчыцкім павеце, — Прахорава (Гомельскі павет), капітана Хохлі, атамана Дзергача, пар' Чадая, Зайцова, Кузьнянова і інш.

Паўстанцы ня маюць умацаванага за сабою прастору, ня робяць спроб уседаіць у буйнейшых асяродках, ня злучаны якой-небудаь палітычнай праграмай.

Асабліва заўзятае і паважнае змаганьне з бальшавікамі ёсьць у Меншчыне. Бальшавікі пішуць: Аддзелы бандытаў дасканальна ведаюць, колькі і дзе стаіць чырвонага войска, яны дужа дысцыплінаваны, папаўняюцца быўшымі салдатамі і афіцэрамі.

Самыя вялікія баі з бальшавіцкімі аддзеламі былі ля станцыі Жыткавічы, дзе быў разьбіт бальшавіцкі аддзел Ратушняка, вокал Петракова над Прыпяцьцю, дзе былі зусім разьбіты 2 конных кубанскіх палкі і 5-ты пешы зіградзіцельны аддзел, між Мозырам і Сарнамі зьніштожан карацельны аддзел і наастатак каля самага Гомля злучаныя паўстанчыя аддзелы пасьля нязнычайна крывавага бою прымусілі адступіць да самага горада пэлую бальшавіцкую дывізію. На некалькі дзён паўстанцамі былі заняты мясьцечкі і гарады Шацк, Хоўмічы, двойчы Мозыр, Слуцак, Азарычы, стан. Капцевічы, стан. Васілевічы, стан. Старыя Дарогі, высаджан у паветра воінскі цягнік пад Рэчыцаю і інш.

ЛІТОЎСКІЯ СПРАВЫ.

Злучаныя Штаты неўзабаве прызнаюць Літву

„Новый Мир" (№ 254) паведамляе: сябар амэрыканскага кангрэса Чэндлер, які нядаўна вярнуўся з Літвы, заявіў, што Злучаныя Штаты неўзабаве прызнаюць Літву.

Мітынг-пратэст.

Тая-ж газэта (№ 254) паведамляе: у Нью-Іорку адбыўся вяліаны мітынг амэрыканскіх ліцьвіноў, на якім былі прачытаны тэлеграмы з Вільні аб высяленьні 1 кастрычніка з займаных будынкаў віленскай літоўскай гімназіі, прытулку, закрыцьці віленскіх літоўскіх газэт, банку і іншых установ. На мітынгу прынята чарга рэзалюцый, некаторыя з якіх пасланы прэзыдэнту Гардынгу, сэнатарам і сябрам кангрэсу. Амэрыканскія ліцьвіны вымагаюць ад ураду Злучаных Штатаў Амэрыкі, каб ён прыйшоў на помач літоўскім жыхарам пад польскім панаваньнем.

Юбілей літоўскага дзеяча.

23-га лістапада г. г. вялікім сходам літоўскага віленскага грамадзянства сьвяткаваліся 70-я ўгодкі з дня нараджэньня выдатнага літоўскага вучонага і грамадзкага дзеяча д-ра Басановіча, які зьяўляецца закладчыкам ў Тыльзыце ў 1883 г. першае літоўскае часопісі „Auszra". У 1907 годзе д-р Басановіч заснаваў Літоўскае Навуковае Таварыства, старшынёю якога зьяўляецца да сягоняшняга дня.


Апрача гэтага, за свой век д-р Басановіч мае шмат іншых заслугаў перад сваім родным народам, палажыўшы шмат свае працы ў нацыянальны літоўскі рух.

Пасьля нялічаных прывітаньняў юбіляра ад розных арганізацыяў, вітаў яго сваім пяяньнем і хор літоўскае моладзі, які паміж іншым прыгожа выканаў Нацыянальны Літоўскі Гимн і яшчэ некалькі ўрачыстых сьпеваў.

На ўрачыстасьці былі відныя прадстаўнікі і беларускага віленскага грамадзянства.

Беларуска-літоўскае збліжэньне.

Літоўскія газэты паведамляюць, што 19 лістапада г. г. ў Коўні адбылося пасяджаньне прадстаўнікоў літоўскага ураду, на якім разглядаліся пяўнейшыя спосабы літоўска-беларускага збліжэньня.



Ай Кітаб з беларускага музэю Я. Луцкевіча.

Пятая частка страніцы. Чытаецца так: „Цемна было, вочы сьветласьці не відзелі. Куры не пелі, сабакі не брахалі. Дошч ішоў цемна было, вецер веяў. Разумеў, што судны дзень настаў".

Ай Кітаб.

У 1918 годзе Я. Луцкевіч знайшоў у Сорак-Татарах, ваколіцы пад Вільняй, рукапісную кнігу „Ай Кітаб", аб каторай пісаў вось што: „Літоўскія татары-магамэтане, якія дагэтуль жывуць у Меншчыне і Віленшчыне, пасяліліся ў нашым краі ў пачатку XV веку. Яны былі выпісаны, як успамагаўчае войска проці крыжакоў, вялікім князем Вітаўтам. Пасьля вайны яны асталіся ў нашым краі, дасталі права жаніцца з дачкамі тутэйшых баяр-шляхты і прынялі ад іх фаміліі, звычай і мову беларускую; толькі вера асталася магамэтанская. Вось, для духоўнае патрэбы татарскія муллы („молна") арабскімі літэрамі пабеларуску перапісалі і пераклалі сьвятую кнігу „Ай Кітаб", зьбеларушчаную ў „Кіцёп".—„Ай Кітаб", сьвятая кніга, гэта ёсьць тлумачаньне Корану, яго прыповесьці важнейшыя. Знаньне арабскае мовы хутка загінула, асталося толькі знаўства пісаць арабскімі літэрамі і чытаць напісанае паарабску. Мы бачым яшчэ шмат дакумэнтаў судовых, падпісаных мясцовымі татарамі паарабску, але словамі беларускімі. Гэта йдзе праз увесь XVI і XVII век".

Знойдзены Я. Луцкевічам „Ай Кітаб"—вялікая рукапісная кніга, зложаная з колькісот страніц, у вокладцы, без пачатку і канца, пісаная характарам 16-га або пачатку 17-га веку. На некаторых страніцах радок беларускага тэксту йдзець пад радком арабскім (гэтак на нашым зьнімку). Але найчасьцей тэкст толькі беларускі, сярод якога стаіць часам адно ці некалькі сьпецыяльных слоў магамэтанскай рэлігіі.

Апрача літэратурна-паказаўчага характару, беларускі „Ай Кітаб" маець для нас вельмі важнае і гістарычна-філёлёгічнае значаньне, як цэнная памятка нашай жывой старадаўнай мовы. Яна маець у сваім правапісе дзьве характэрных асаблівасьці, якіх у кірылічным тэксьце беларускіх старых грамат у такім пеўным выглядзе ня маем: 1) ясна азначаны гук „дз" (напрыклад, у словах дзень, відзелі і інш.); 2) асобным знакам паказаны гук „ць" (напрыклад, у словах: цемна, сьветласьці, якія па кірылічнай транскрыпцыі былі-б напісаны „темна", „сьветласьті"). Адгэтуль відаць, што гукі „дз" і „ць" выгаварываліся ў нашай жывой мове ад найдаўнейшых часоў. Беларускі „Ай Кітаб" пакуль што мала быў на воку вучоных мовазнаўцаў, дык магчыма, што калі-небудзь з яго даведаемся і аб іншых важных асаблівасьцях нашае старадаўнае мовы.

Аб лавецтве рыбы у Браслаўскім павеце.

Невялічкі Браслаўскі павет, — акраіна Беларусі, — мае вялікае прыроднае багацьце ў вазёрах, каторых тут болей за 50, прасторам каля 10,000 дзесяцін. Азёры багаты рыбай самых лепшых, буйных сартоў. Да вайны тутэйшая рыба йшла на Петраградзкі рынак.

Але наш беларускі селянін - рыбак дагэтуль мала карыстае з рыбнага багацьця свайго краю. Азёры належуць або да казны, або да царквы, або да паноў, а дзержуць іх у варэндзе капіталісты, па большай часьці жыды. Наш рыбак ловіць рыбу пад загадам арэндатара, і дастаюцца яму за ягоную працу толькі аб'едкі ад раскошнага столу гандляроў - арэндатараў, каторыя адпраўляюць рыбу на дарагія рынкі ў Вільню і Варшаву і множуць у дзесяткі раз свае капіталы.

Але пара прыйсьці да розуму і нашаму лаўцу. Пара яму успомніць, што грамада — вялікі чалавек, куды большы і крапчэйшы ад усялякіх сьпекулянтаў. Рыбаком трэба складывацца ў кампаніі па вёсках ці валасьцёх, самім браць ў арэнду бліжэйшыя азёры і самім прадаваць рыбу. Для адпраўкі і прадажы рыбы найлепей былоб арганізаваць павятовы рыбацкі хаўрус. Спадзяючыся ўсякіх перашкод са стараны рыбных таргоўцаў, можна было-б у гарадох згаварыцца з каапэратыўнымі суполкамі і прадаваць рыбу патрабіцелям з рук у рукі, мінаючы пасрэднікаў.

Для Браслаўскага павету гэта справа вялікай вагі. Зямля тут ня дужа добрая, і той у сялян надта мала. Да вайны многа мужчын хадзіла на зарабаткі, болей усяго ў Рыгу на водныя работы па разгрузцы плытоў. Цяпер на старане ніякіх зарабаткаў няма, і само жыцьцё прыказывае ўзяцца за розум для адшуканьня куска хлеба.

Супольная арэнда азёр для самых лаўцоў — дзела пэўнае і даходнае; прытым на выплату арэнды—і капіталу ня так ужо многа патрэбна, напрыклад, казённыя азёры былі сёлета здадзены за пяць фунтаў рыбы з дзесяціны ў год. Што датыча сяцей, чаўноў і другой снасьці, дык яна ў часткі ёсьць і цяпер у лаўцоў, а чаго не хватае — супольнымі сіламі пры сваёй працы і рабоце зрабіць будзе ня дужа цяжка.

Адно толькі цяжка, — гэта згаварыцца самім рыбакам для супольнай працы. У гэтым кірунак павінны прыняць на сябе найболей сьвядомыя рыбакі і мясцовая народная інтэлігэнцыя.

Браслаўскія лаўцы! Вазьміцеся за розум, згаварывайцеся ў хаўрус, каб даходы ад сваей крывавай працы вырваць з цэпкіх рук гандляроў—эксплуататараў.

Антон Рубескі.

Беларуская справа у Латвії.

Беларусаў па урадовай перапісі 14 чэрвеня 1920 г. лічыцца ў Латвіі больш, чым 60 тысяч, каторыя размесьціліся больш за ўсё ў прырубежнай паласе Дзьвінскага і Люцынскага паветаў.

Кожны, хто хоць троху пазнаёміўся з гісторыяю Беларусі, ведае, які пакутны шлях прышлося прайсьці Беларускаму народу, пры якіх цяжкіх варунках яму давялося бараніць сваю самаістнасьць ад імпэту чужых уплываў, як яго зямля часта была пляцам рэлігійнага і палітычнага змаганьня і як, нягледзячы на ўсе гэтыя няспрыяйныя ўмовы, беларус і дацяперашняга часу захаваў свае нацыянальнае аблічча, сваю мову і літэратуру.

Беларус па свайму зразуменьню праўдзіва

Першая беларуская баляда „Нячысьцік" А. Рыпінскага *)

А калі кумок прышоў,
Каб мужыка не нашоў,
Слала Мікіту ў лес,
І там яго турнуў бес.
Абы ў ласку ей папасьць,
Ішоў, бедны, хоцьбы красьць!
Ды яшчэ ж ня ў тым канец:
Адкуль ішла пад вянец,
Адтуль, кажу, ўжо ніколі
Царквы ня відзела болей
І, як мне Марта казала,
Чарту душу запісала.
А чорт то быў із чарцей!
Мудрагель нейкі, зладзей:
Так ей ён верна служыў,
Гдзе ні пайшла, пры ей быў;
Што хацела, то купіў;
Мужыка, як мог, дурыў,
А жоначцы спагадаў,
Усячыну падсуваў,
Пакуль душу не паймаў.
Не адзін шалтаў сусед,
Што ў Мікіты Бога нет.
Яны то ўжо і згадалі!
Паглядзім, што было далей.
Як мы ўжо тое казалі,
У Мікіты вяпрок быў;
Ен яго, як мог, блюдзіў,
Штоб толькі пост перабыў.
Мікіта наш ня быў ласы,
Жонка-ж любіла кілбасы;
А чорт за жонкай хадзіў!
Як пачаў яе дурыць,
Вот так, так ашаламіў,
Што ў пост сьвінку забіла,
Абскрабла і абсмаліла,
Ужо кілбас нарабіла.
Муж пашоў водкі прынесьць
Ад арандаркі цішком,
І хацелі ўжо есьць,
Аж тут ня было на чом!
Нячысьцік, знаеш, ня спаў:
Таму ужо так і быць!
Ен іх здумаў скалаціць,
Пабач, што ім заіграў!
Жонку ў каршэнь—па талерку,
Мікіце—ў зубы бутэльку:
Буль, буль, буль, буль, буль—і вот
Пайшла сівуха у рот!...
Бес жа рад, што іх паймаў
так гладка у самы час!
Каб і ня елі кілбас,
Другі загнуў ён кручок:
Цап за мяса, дый уцёк!
А што-б ня было пазнакі,
Наслаў кошкі і сабакі
і ўсякаму у куток
кінуў кілбасы кусок.
Мікіціха ў хату мах!
Аж тут глянуць ажно страх!
Кошкі мяўкаюць, дзяруцца,
Сабакі сабе грызуцца!
Усе сьцены ну-ж траsшчаць!
Лаўкі і сталы—скакаць!
А на печы чорт-прахвост,
Узяўшы у зубы хвост,
Патуль шчокі надымаў,
Аж як на дудзе зайграў,
А пасьля захахатаў,
Прыгнуў на стоўб, ды прапаў.
Мікіціха—да мужа!
Чуць што не ўхапіўшы ножа:
„Якія-ж чэрці у нас?
„Ні гарэлкі, ні кілбас!
„Хто нашу сьвініну зьеў?!
„Гдзе ты гарэлку падзеў?!!!
„Пастой, сабака, пастой!!!...
(Хроп па шчацэ, па другой!)
„Мая цяпер, мая уласьць!!..."
Як не пачнець яго клясьць:
„Каб ты скрозь зямлю прапаў,
„Астатні раз паэіраў!...
„Уту, нячыстая твар!
„Паганы Башкір! Татар!
„А што-б ты здох! Што-б асьлеп!
„Каб ты згарэў! Што-б паліо!!!..."
Мікіта-ж таго ня чуець,
Што яна так гамануець:
ён то ня многа і піў,
Ды чорт с панталіку зьбіў!
Кажу, так горка упіўся,
што і з ног ужо зваліўся,
Абсьлініўся, абблявауся...
—Кінем яго, што-б праспаўся.
Мікіціха не п'яна,
Ды ўжо чортава яна!
Захацела як нібудзь,
Каб і Бога абмануць!
Бес-жа ад бабы мудрэй:
На ўсё прыдумаў зацей!
(К яму трудна раз папасьць!)
На што-ж было мужа клясьць?!..
Віць, ксёндз Білеуш казаў,
Што Бог клясьць не прыказаў;
Бо хто хоча другіх клясьці
І кажа: „Каб ты прапаў!",
Можа і сам прапасьць.
А усім такім цяпер
Вот в Мікіціхі прымер!
Яна, чуць тое сказала,
Бач: згарэла і прапала!...
Чорт хатку смалой абліў,
Узяў яе, дый запаліў;
Як у пекле, сам пяець,—
—Яму і тут усё роўна!
Хата ўжо чарцей поўна,
А чарцянят поўна клецы!
Скачуць, верцяцца па клеці,
Кажу, як хрышчоны дзеці!
Усякі весел, ды і рад,
Што іх бацьку пайшло ў лад.
А шатаны-ж іх там знаюць,
Што яны за сілу маюць?!
Вот так, як птушкі, лятаюць!!!
Адзін задумаў скакаць
Спад лаўкі аж на палаць!
Другі цуп-луп на калок
І тру-ру-ру, як млынок!...
Трэці ходзіць на рагах!
Чарту нішто не-ўпрамах!
Гэты на агонь дуець,
Агу! занялася клець!...
Той дзьверы падпёр, як дуб,
А той, узяўшы кацюбу,
Шмык у хату скрозь трубу!
І Мікіціху за чуб!
Торгаў, сморгаў па палу,
Тады піхель у смалу!!!...
Вотаж табе! Ня будзь ласа!
Гдзеж цяпер твая кілбаса?
Усё прапала ў адну ноч...
І назаўтра, чуць сьвет,
Мікіціхі ўжо нет!
Уся воласьць тут прыйшла,
І нікога не знайшла:
Хатка скрозь зямлю пайшла!!!...
Я запісаў ту штуку
Тым жоначкам на навуку,
Што скаромнае так любяць.
А такіх у нас ня мала!
Віць, цяперачка настала:
Нішто ўжо ім ня грэх!
Бог і цэркаў пайшлі ў сьмех!...

Аляксандар Рыпінскі.

Перапісаў Ст. Несьцюшка-Буйніцкім у Пецярбурзе 16. XII. 1882 з лондонскага выданьня 1853 г.
З архіву Івана Луцкевіча.

*) Гл. № 10.

Некалькі слоў аб нашым сельска-гаспадарскім школьніцтве.*)

Справа сельска-гаспадарскага школьніцтва ў Серадковай Літве стаіць бардзей дрэнна, чым дзе-небудзь, а з ёю і справа школ садоўніцтва і агародніцтва. Як дагэтуль чутно, адчыняецца іх у ваколіцах Вільні аж са 4 школы зараз і ў паветах да двух школ, але ніводная ні з праграмы працы сваей, ні з заданьняў, якія сабе ставе, не адпавядае тым вымаганьням, якія садоўніцкі промысел у сучасных варунках ставе нам. Перажытыя і перажываемыя намі харчовыя крызысы змусілі нас слушна зьвярнуць сваю ўвагу на садова-агародніцкі промысел. Практыка цэльных вякоў і апошніх дзён паказывае нам, што Край наш мае ўсе дагоднасьці дзеля разьвіцьця гэтага промыслу і што садоўніцтва, а з ім агародніцтва стануць бадай чы не найвялікшымі крыніцамі багацьця нашага; зважаючы-ж на тое, і справа садова-агародных школ павінна бліжэй, чым каго-колечы, датычыць нас, як жыхароў Краю. Праз дзьве групы грамадзянства магчыма стварэньне садова-агародных гаспадарак у нас. Першую групу зложаць малапольныя жыхары-земляробы і дробныя ўласнікі з паміж абяднелай шляхты; змусіць іх да гэтага нявялікая даходнасьць іх цяперашніх гаспадарак, а праз гэта немагчымасьць з гэтага заробку пражыць паводлуг сваіх вымаганьняў. Другую групу зложаць даволі вялікшыя ўласнікі, розныя прамыслоўцы, усялякія суполкі, каапэратывы і рожныя грамадзкія арганізацыі. Кіраваць гаспадаркамі такім чынам будуць у першай групе самі-ж земляробы або члены іх сям'і, у другой—часьцей нанятыя сьпецыялісты садаводы і рэдка самі загадчыкі. Істнуючыя ж садова-агародніцкія гаспадаркі будуць перабівацца, як гэта і робіць значны лік іх, на ўсялякіх садоўніках-практыках —без навет агульнай ніжэйшай адукацыі, бо ўласнікі гэтых гаспадарак уважаюць яшчэ за патрэбнае баймаць садоўнікаў танных, неадукаваных, каб з іх у зіме, у не сезоне зрабіць патрэбных людзей да усялякай работы, навет лякэйскай. Праўда, варункі жыцьця мабыць хутка змусяць перамяніць такі погляд на садоўнікаў наагул, ды толькі гэта справа будучыні. Маючы на мэце вышэй апісаныя два тыпы садова-агародных гаспадарак і ім патрэбных кіраўнікоў, мы і павінны пастарацца як найлепш гэтых будучых кіраўнікоў падгатаваць, стварыўшы ім патрэбныя школы. Каб вясьці невялічкі садок чы агарод патрэбны, бяз лішняга балясту, практычныя знаёмасьці спосабаў культуры гэтых раслін, і то ў вузкіх рамках сьпецыялізацыі і гэтая навука займае прынамся адзін год, ня болей. Гэта вельмі дагодна для нашых земляробаў, бо кожны з іх калі і захоча навучыцца чы навучыць сына, дачку гэным навукам, то ў кароткі працяг часу, бо работа ў полі і гаспадарцы займае ўсю сям'ю, і на доўгую навуку ў земляроба не хапае свабодных грошы і часу.

Дзеля падгатоўкі кіраўнікоў для вялікіх садова-агародных гаспадарак трэба часу шмат болей. Дзеля гэтага павінна быць створана школа тыпу тэхнікумаў з ня меней як трох-летнім курсам, з добра настаўленымі: прамысловай гаспадаркай, садова-агароднай (кожнай паасобку); паказнымі садамі, школкамі, цяплiцамі, агародамі і паркам, агародамі-садамі дзеля навуковых проб і садам дзеля культуры чыстых сартоў дрэў і кустоў. Падбор сіл пэдагогічных павінен быць бяз усялякага шванку—як з боку сьпецыяльнага, так і выхаваўчага. Школа гэта павінна дбаць, каб падгатовіць нам людзей-сьпецыялістаў, знаёмых з арганізацыяй усялякага рода садовых гаспадарак, садаводаў-інструктароў, садаводаў - арганізатараў. Падбіраць у гэту школу вучняў трэба будзе знаёмых з гаспадаркай наогул, яшчэ лепш садоўнікаў, але з агульнай адукацыяй ня меней ніжэй.

*) Друкуецца ў дыскусійным парадку.—Рэд.

дэмакрат—„мужык“. Варункі мінулага злажыліся такім кшталтам, што беларускі народ, як і латышскі, аказаўся без свае нацыянальнае зямельнае арыстакратыі і вялікае капіталістычнае буржуазеі. Паноў ён бачыў толькі палякоў (і пасьля маскоўцаў), каторыя з узгардаю абрашчаліся з ім, як з „сьмердам“, „хлопам“, „быдлам“. Да паноў у яго заўсёгды была затаёная злоснасьць, бо яны давялі народ беларускі, як і народ польскі, да ўбогасьці і зруйнаваньня. Беларускія губэрні шмат часу лічыліся бяднейшымі ў Расеі.

Цяжкі быў для Беларусі 3-х вяковы польскі ўціск, але не лягчэй дыхаў беларус і пры царскай Расеі. Усякі намёк з боку беларускага народу на самаістнасьць, выяўляўшыся ў выданьні беларускіх газэт, кніжак, ў арганізацыі беларускага тэатра і беларускае школы, разглядаўся як праява сэпаратызму і перасякаўся ў корані.

Тая бура, каторая пранеслася ў Расеі ў сакавіку 1917 г., дала магчымасьць і Беларусі поруч з другімі народамі самастойна разрашыць усе грунтоўныя пытаньні, зьвязаныя з яе далейшым істнаваньнем, аж да абвешчаваньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі на кангрэсе ў Менску 17 сьнежня 1917 г.

Рыжскім мірным дагаворам між Савецкай Расеяй і Польшчай цела Беларусі было разрэзана на дзьве галоўных часьці.

Некаторая частка беларусаў апынулася, як нацыянальная меншасьць, у межах Літвы і Латвіі.

Якія-ж важнейшыя заданьні і мэты Беларускіх нацыянальных меншасьцяў у гэтых землях?

Мэты гэтыя—зьберажэньне свайго нацыянальнага аблічча, падняцьце эканамічнага дабрабыту і культурнага жыцьця.

У інтарэсах прыбліжэньня да азначаных мэтаў ў Латгаліі згуртавалася беларускае культурна-прасветнае т-ва „Бацькаўшчына“. Праца гэтага т-ва расьце вельмі спорна. Ува ўсіх больш—менш значных цэнтрах Латгаліі арганізаваліся яго аддзелы, адкрываюцца беларускія бібліатэкі, працуе беларуская трупа, закладаюцца хоры, а ў апошні час прыступлена ўжо да стварэньня беларускіх каапэратываў.

Урад Латвіі ідзе на спатканьне культурна-прасветным патрэбам беларусаў: Кабінэтам Міністраў пастаноўлена адчыніць Беларускі Аддзел пры Міністэрстве Прасьветы, які ўжо і адчынен.

Гэты акт выяўляецца саўсім справядлівым і к часу пасьпеўшым для беларусаў, каторыя да астатняга часу ня мелі таго, чым ужо даўно зыскаліся ў Латвіі другія меншасьці.

Сьветлаю радасьцю азначылася гэтая пастанова ў душы кожнага сьвядомага беларуса, бо з гэтага часу будзе ўстанова, каторая ня толькі павінна рупіцца а прасьвеце беларускага жыхарства ў Латвіі, але і быць абаронцам яго культурных інтарэсаў.

Азначаная апека і абарона тым больш патрэбна, што гэтыя інтарэсы беларуса церпяць страту ад няўвагі, векавога звычайнага паніжэньня і недахватку самасвядомасьці саміх-жа беларусаў.

Вось зачым беларусы павінны стаяць на варце сваіх інтарэсаў і не дазваляць іх парушэньня.

І чым больш будзе нацыянальнага адзінства і зьвязку між беларусамі, чым мацней у іх будзе выгадавана самастойнасьці ў думках і чым менш будзе палахлівасьці, а больш пеўнасьці у сваей справе, тым больш дужасьці будзе мець голас беларуса ў агульным хоры народаў. І тым шчасьлівей выявіцца яго будучы.

Усе беларусы Латвіі цяпер цесна згуртаваліся навокала Беларускага Аддзела пры Міністэрстве Прасьветы, памятуючы, што ў згодзе і еднасьці—моц.

Вучыцель з Латгаліі.

Аляксюк у каапэрацыі.

Лёгка зразумець, што такое Аляксюкоўскае тварэньне—„Краёвая Сувязь“, і кожнаму зразумела, якую роль яна іграе ў беларускім жыцьці. Адно толькі не саўсім яшчэ выявілася: што-ж хочаць стварыць Аляксюк ў каапэрацыі? Ведама, што прадстаўнік „Краёвай Сувязі“ запрашаўся на Апрвізацыйную Раду на тых-жа асновах, як і прадстаўнікі каапэратыўных Саюзаў. Пан Вярнікоўскі ад Аляксюкоўскай арганізацыі зьяўляўся на нараду Дырэктара Дэпартамэнта Апрвізацыі з Саюзамі Каапэратываў (пры Нямчыновічы) і толькі дзякуючы пратэсту прадстаўнікоў каапэрацыі Дырэктар змушаны быў заявіць, што „Краёвая Сувязь“ запрошана „па абмылцы“. Але новы Дырэктар Дэпартаменту Апрвізацыі п. Вендзягольскі ужо п. Аляксюка запрашае на паседжаньне Рады Апрвізацыйнай, і п. Аляксюк пападае у камісію „па змаганьню з сьпекуляцыяй“. Гэта самая „Краёвая Сувязь“ адыгрывае ў апрвізацыі значную ролю, атрымлівае дужа значныя крэдыты і значны лік прадуктаў ад Дэпартамэнту Апрвізацыі і іх разьдзялае.

Пры станцыі Залесьсе, над флагам каапэрацыйных складаў, поплеч з складамі Віленскага Саюзу Каапэратываў, „Краёвая Сувязь“ адчыняе свае склады і шырока з іх распрадае прадукты, атрыманыя ад Польскага Ураду. Уздоўж паграпічнай паласы адчыняецца нейкая відзімасьць каапэратыўчыкаў, якія покуль што творацца ні-то для гандлю з Расеяй, ні-то яшчэ для якіх мэт. Выглядае як быццам поплеч з Віленскім Саюзам Каапэратываў Аляксюк па загаду Делегатуры творыць новы, „Беларускі“ Саюз Каапэратываў. Магчыма, што гэта так сабе, для запасу, каб відаць было, што Віленшчына не Гарадзеншчына, гдзе задушана ўся беларуская каапэрацыя. Тут сам польскі Урад дапамагае Аляксюку тварыць „беларускія“ каапэратывы. Зразумела, што гэта праца Аляксюка дужа псуець запраўдную каапэратыйную працу, але спадзяёмся, што падрабляньне Аляксюка пад каапэрацыю наша сялянства зразумее і, замест таго, каб ісьці да Аляксюкоўскай каапэрацыі, будзе падтрымліваць свае даўнішнія каапэратывы.

А можа Аляксюк з сваёй „Сувязьзю“ высунут на той выпадак, што калі і посьле аб'яднаньня Віленскага Саюзу Каапэратываў і „Związku Ziemi Wileńskiej“—Управа новага Агульна-Краёвага Саюзу (стварэньня якога так дабіваюцца палякі,) ня будзе задавальняць палякоў, то Аляксюку будзе даны новы прыказ псаваць працу і новага Агульна-краёвага Саюзу?

Каапэратар.

Агляд друку.

Адно самае няўдалае польскае газэтнае агенцтва падало такія ведамасьці, сьпісаныя намі з вартай яго „Gazety Wileńskiej“:

Варожая беларуская агітацыя.

Водле інфармацый, атрыманых з Ашмянскага павету, беларуская агітацыя у Барунскай гміне робіцца небясьпечнай. Доказам можна быць гэткі факт: 13-га, 14-га і 15-га лістападу было сьвяткаваньне 200-летняга юбілею Барунскага касьцелу. Людзей сабралася надта многа. Раптам сярод таўпы пусьцілі пагалоску, што паліцыя хоча арыштаваць тутэйшага ксяндза Пятроўскага. С'агітаваная такім спосабам таўпа не выхадзіла тры дні з касьцелу, каб бараніць ксяндза. Тутэйшы паліцэйскі пастарунак хацеў пераверыць таўпу, падаючы да агульнага ведама, што падобнага за аду ня было і ніхто ня хоча арыштовываць ксяндза. Аргумэнты тыя, аднак, не пераверылі с'агітаваные таўпы, і яна да канца засталася недаверлючай.

Як бачым, барунская паліцыя, знамянітая з часу закрыцьця Беларускай Сэмінарыі ў Барунах славамі аднаго свайго сябра: „Хто будзе чытаць беларускія кніжкі, таму кулька ў лоб!“—паліцыя гэта загаварыла цяпер „аргумэнтамі“ (даводзячымі данымі)! На жаль, яе „аргумэнтацыі“ можна даваць веры роўна столькі, сколькі можна знайці „варожай беларускай агітацыі“ ў паказаным паведамленьні газэтнага агенцтва.

Запраўды-ж, беларусам агітаваць няма патрэбы: за іх агітуюць, ці лепей кажучы-усьведамляюць беларускае сялянства тыя, каторыя пасталіся пасадзіць ксяндза-беларуса ў турму і выгнаць яго з парахвіі наўпрэкі агульнай волі ўсіх парахвіян.

Слова гонару, панове-ворагі: беларускія „агітатары“ ніколі не спадзяваліся, што вы так добра й борзда патрапіце споўніць іх работу.

Працуйце й далей!

У яму, якую капаеце для беларусаў, уваліцеся самі (хоць панашаму лепей, каб ніхто ня быў у ёй)

А. Мсьціслаўскі.

Лес шумеў.

Лес шумеў... Ледзьва чутнымі гукамі
Ропат соснаў высокіх спльіваў—
Вецер дзіўна-прыгожымі згукамі
Новы шэпт, новы сьпеў выклікаў...
Паміж комлямі соснаў чырвонымі
Зьзяў крывавы васеньні заход...
Далякосьцямі неба бяздоньмі
Выплываў белых зор карагод...
А між імі з усьмішкай халоднаю
Усходзіў месяц, прыбраўшыся ў мглу,
Гэны вечар малюнкамі роднымі
Выклікаў нейкі смутак-тугу...
Смутак рос... і зыбучымі хвалямі
У душу уліваўся маю;
Як туман, неабсяжнымі далямі,
Залівае у восень зямлю...

1921 г. **Натальля Арсеньнева.**

Пакіненыя хаты.

Аднойчы ўлетку 1920 г. я забрыў далёка на ўскрай Вільні і апынуўся паміж хат, пакіненых гаспадарамі, паўцякаўшымі ў 1915 годзе ад немца ў Расею.

Як тут смутна!

Ня чуваць вясёлых дачных галасоў, дзвончага звонкага сьмеху і граньня на верандзе грамафону.

Цішыня і могільнасьць. Забітыя вокны з пакрадзенымі там-сям шыбамі. Пыл і павучыньне на сходах.

Сярод кляноў праляцеў сіваграк. Краі ў яго чорныя, а пасяродак, між галавы і хваста—сіні.

Я лёг на траву пад кустом і глядзеў угару на веццё.

Патроху заснуў.

Мне прысніліся старадаўныя муры сярод лесу. Аказалася, што там жывець лясьнічы. Швайцар (я падаў яму руку) не хацеў пусьціць мяне, але я настойліва прасіў яго схадзіць да лясьнічага і сказаць, што я прыехаў у гэтую глуш з далёкага краю на ўсё лета і што я цікаўлюся старасьвеччынай.

Швайцар, пачуўшы, нізка пакланіўся мне і шырока расчыніў дзьверы.

Я пайшоў па бязконцых мураваных калідорах і прыбіўся ўрэшце да вялізнай салі... поўнай чалавечых костак, чарапоў і яшчэ недагніўшых трупаў. Лясьнічы стаяў збоку і панура ўглядаўся на ўсю гэтую старасьвеччыну. Мне зрабілася жудасна, і я з цяжкім чуцьцём прашнуўся. Ад пакіненых хат веяла такім сумам, што я барджэй пашоў проч.

4. X.—1921 г. **Максім Гарэцкі.**

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

М. Гародзей, Нясьвіскага павету.

Са 2 м-цы таму назад у нашым павеце шырока апавясьцілі, што ўсім грамадзянам-земляробам, у каторых астатняя вайна пазабірала коні, будуць прадавацца па даступнай цане, вайсковыя коні, трэба толькі мець на тое пасьведчэньне ад войта гміны. Па два месяцы насілі нашы абяздоленыя земляробы ў кішэнях гэтыя дакумэнты і чакалі гэтае дапамогі. Урэшце ў чацьвер 17 лістападу прышла дапамога: у Гародзеі назначана ліцытацыя вайсковых коняй. Пазычалі, шукалі, скраблі нашы мужыкі маркі і з цямна зьявіліся

чатырох клясаў гімназіі, каб у трохлетнім курсе надта не заграмаджваць вучняў агульнымі навукамі, а толькі тымі, што сустрэнуцца ў іх сьпецыяльнай рабоце. Пасьля аканчаньня школы трэба, каб кожны з вучняў адбыў практыку ў прамысловых гаспадарках чы ў Польшы, Расеі чы за граніцай, і тады толькі ўпускаць іх у працу. Варта было-б, каб аб практыцы дзеля помачы вучням і нарыхтаваньню патрэбных нам сьпецыялістаў, зьвязацца з прамысловымі гаспадаркамі за граніцай і то пеўных тыпаў, як школкі садовыя, насенных гаспадарак і т. п., каб яны прыймалі заўсёды ў першую чаргу нашых вучняў, плацячы ім за магчымасць практыкавацца у іх. Пры гэтай-жа школе трэба і адчыніць аднагадовыя курсы дзеля навучаньня, як раней было сказана, садоўнікаў з гаспадарак першай групы, земляробаў і іх сямей. Тут бы была эканомія ўва ўсім і ў пэдагогічных сілах і ў паказовых рэчах і стварылася-бы спайка паміж аднэй і другой групай вучняў, будучымі садаводамі і садоўнікамі, што памагло-б у супольнай рабоце іх у будучыні пры арганізацыі на прамысловую на краёвых садова-агародных гаспадарак.

Закладаемыя цяпер у нас школы садоўніцтва паходзяць ува ўсім па такія-ж школы расейскія і польскія даваеннага фасону, права на жыцьцё яны ў нас бадай ня маюць, бо што іх прарадзічы зрабілі дзеля паднясьця садоўніцтва і агародніцтва ў сябе? Выходзячыя з іх садоўнікі, надта мала адукаваныя навет сьпецыяльна, часткай ішлі на працу дамоў у свае гаспадаркі, часткаю ў прамысловыя ў краю чы за граніцай, а рэшта ня хочучы закабаліцца ў двары сярэдніх і большых уласнікаў на садова-лякайскую работу, кідалі садоўніцтва саўсім, ня маючы сіл, ні добрых сьпецыяльных пазнаньняў, каб стварыць, адваяваць сабе магчымыя варункі працы і быту. Бо хаця гэтыя школы і стараліся стварыць першым чынам танна дваровага таннага садоўніка-тэорэтыка (ды каб не зазнаваўся—называлі яго „садовым рабочым“) гэнага зрабіць не патрафілі, а толькі дарма трапілі грошы ды калечылі людзей. Кожны чалавек, каторы ў фаховай школе, якая яна ні была-б, вучыўся з два, тры гады, будзе мець заўсягды большыя культурныя вымаганьні і патрэбы, чым бедны садоўнік-практык, да якога прывыклі двары з садовай гаспадаркай. Дзеля гэтага ня скупімажся на сьпецыяльныя школы і культурную работу для пашырэньня і адбудовы садова-агародных гаспадарак, бо хутка яны падзякуюць нам за тое, падымаючы наш Краёвы добрабыт.

Сябра Тав. Бел. Школы Садавод **Л. Крыўка.**

Кучкурышкі
14. XI. 21 г.

Школьная палітыка.

Самае балючае пытаньне ў нашай мясцовасьці гэта—школа.—Амаль ня ўсе грамадзяне, навет тыя, якія летась, дзякуючы таму, што ходзяць у касьцёл, лічылі сябе палякамі, сёлета зразумелі, што яны ёсьць сапраўды беларусы-каталікі, і жадаюць беларускае школы. Наагул кажучы, беларускі рух паміж грамадзянамі пачаў цьвісьці, ў поўным значаньні гэтага слова.

Але ўбачыўшы такую справу, польская адміністрацыя энэргічна павяла змаганьне з гэтым рухам. На першым пляне гэтага змаганьня ёсьць школьныя інспэктары. Не аднойчы ўжо беларускія газэты пісалі аб іх і напеўна будуць пісаць, бо на кожным кроку, гэтыя школьныя інспэктары, выяўляюць новыя факты, з якіх усё ясьней робіцца беларусу, што яны хочуць зьнішчыць яго культуру. Усім добра ведама, што беларуская, наагул нацыянальная школа, ёсьць жарало сьвядомасьці ў культурна-нацыянальным адраджэньні. А гэта як раз перашкаджае ў дабіцьці іх мэты—апалячыць беларускага селяніна. Але ўсё-ж ткі па пастанове Рыскае ўмовы іх абавязак даць насяленьню такую школу, якой яно пажадае. І вось мы бачым, што гэты абавязак ёсьць ня што іншае, як абяцанка, бо школьныя інспэктары адмовіліся даць нашым грамадзянам пажаданых імі беларускіх школ. А каб паказаць сябе не вінаватамі ў гэтай справе, дык яны і прыдумаваюць рознага колеру хітрасьці. Зразу, як толькі нашу мясцовасьць ад Сярэдняе-Літвы прылучылі да Польскага калідору, дык школьныя інспэктары пазвальнялі ўсіх тых вучыцялёў, якія ня скончылі вучыцельскае сэмінарыі; а тых якія скончылі вучыцельскую сэмінарыю і далі згоду, за абяцанкі, ехаць у Кракаў, на якіясь-та адумысьля прыдуманыя палякамі курсы, пазалічалі вучыцялямі. А хто ня даў згоды ехаць у Кракаў, той ня гледзячы ні на якую адукацыю, так сама апынуўся ў ліку звольняных; крутня з Кракавам цягнулася аж дагэтуль. Нарэшце школьныя інспэктары убачылі, што беларускія вучыцялі могуць быць для іх вельмі карыснымі і бяз Кракава. Бо калі Валожынскі школьны інспэктар, ні на што не зварочваючы ўвагі стаў прысылаць у школы звольненых беларускіх вучыцялёў—польскіх, дык грамадзяне ад іх адмовіліся і адкрыта заявілі, што калі палякі ім не дадуць беларускае школы, дык яны дзяцей ня пусьцяць да польскіх вучыцялёў. Дык вось школьныя інспэктары і сьцямілі, што беларускіх вучыцялёў карысьней пакінуць тут, чымся іх пасылаць у Кракаў, бо ведама, грамадзяне як быццам да сваіх вучыцялёў пусьцяць дзяцей у польскія школы. Ужо гэтым вучыцялём прысланы польскія падручнікі і яны адчыняюць польскія школы, без усякіх перашкодаў з боку грамадзян. Гэтыя вучыцялі пацяшаюць грамадзян аднэй лекцыяй беларускае мовы ў тыдзень. Добра школьныя інспэктары гладзяць іх па галоўцы, калі яны ўжо агітуюць за польскую школу. Як відаць, у беларускіх вучыцялёў (польскіх пястункоў) ёсьць пакушэньне лучыць ў лік польскай шляхты. Дастаўшы пасады пры польскай уладзе, яны ўжо ганарацца і пачынаюць вычураванца свайёй беларускай справы. Бо ведама, калі беларускі вучыцель адчыніў у сваёй вёсцы польскую школу, дык гэта значыць, што як ён так і ўся вёска жадае польшчыны, яны ўжо ў палякоў на паперы так і лічацца. А здаецца-ж гэтыя вучыцялі самі наракалі на той гістарычны шлях, па якім калісьта пайшла наша перадавая інтэлігенцыя і за польскія прывілеі вычурылася ўсяго свайго роднага і пакінула цёмнага беларуса бяз культуры. Здаецца шмат з гэтых вучыцялёў запісалася у «Таварыства Беларускае Школы,» якое называе іх сапраўднымі сябрамі. Але як мне здаецца, дык яны ня ёсьць сапраўднымі сябрамі такое беларускае арганізацыі, а сапраўдныя Юды-прадацелі; дый навет няма яшчэ ў беларускай літэратуры такога нізкога слова, каб іх назваць! Дый ці можна гэта было падумаць, каб у такую часіну, як ідзець змаганьне за сваю родную нацыю і культуру, і калі ворагі рвуць на кавалкі нашую справу, з ран якой цячэ цёплая кроў і горкія сьлёзы, нашы сыны, тэй цёмнай загнанай беднай вёсачкі, за польскія маркі вычураліся яе і навет прадаюць яе за свае ўласныя, мо быць часовыя, карысьці. Памятайце, грамадзяне вучыцялі, што вы ўжо ня лічыцеся вернымі сынамі нашае бацькаўшчыны, і гэтая ад вякоў вякамі загнаная вёсачка вычураецца вас і пракляцьце яе ляжа на вас і дзетак вашых!..

Праўда, ёсьць такія вучыцялі, якім здавалася бы, што дзеля кавалка хлеба і трэ было-б згадзіцца ў польскую школу. Але як раз ёсьць на адварот. Тыя, якія маюць гаспадаркі, даволі хлеба і да хлеба, пазгаджаліся ў польскія школы; а тыя звольненыя вучыцялі, якія ня маюць гаспадаркі і якім ужо неаднойчы інспэктары радзяць узяць польскую школу, усё-ж ткі не згаджаюцца. Грамадзяне, звольненыя вучыцялі, хаця-ж вы не прадавайце культуры замучанага свайго брата беларуса, хаця-ж вы астаньцеся вернымі сынамі свае бацькаўшчыны. Ня хістайцеся духам і верце, што ў канцы канцоў стукаючым адчыняюць і прасячым даюць, верце што, за мукі вашы нагарода ёсьць вам у будучыне. Цярпеньне гэта ёсьць вялікі кавалак здароўя душы чалавека! Вы бачыце як да вашага стуку ўжо пачалі прыслухацца. Вялейскі школьны інспэктар ад усіх звольненых вучыцялёў прыймае просьбы і навет іншым даў ужо беларускія школы. У Дунілаўскага школьнага інспэктара па загаду начальніка гаспадарства п. Пілсудскага адчынена больш 10 беларускіх школ. Але вельмі шкада, што з вучыцялёў Дунілаўскага павету, большасьць не сьвядомыя беларусы, а прыхільнікі расейскае школы; за тое іх паважае п. інспэктар. Гэта відаць з таго, што калі з Валожынскага павету паехаў адзін вучыцель „А“, сьвядомы беларус, праслухаўшы двойчы беларускія вучыцельскія курсы ў Вільні, паехаў да п. інспэктара Дунілаўскага павету, з мэтай дастаць там беларускую школу, дык п. інспэктар адмовіўся даць яму беларускую школу, хаця-ж просьбу і прыняў. Але цікава зразу п. інспэктар стаў угаварываць вучыцеля „А.“ у польскую школу і калі пры просьбе вучыцель „А.“ падаў копіі пасьведчаньняў аб сканчэньні расейскае школы і аб праслуханьні беларускіх вучыцельскіх курсаў, дык п. інспэктар апошняга, ня прыняў. Дык як відаць, Дунілаўскі школьны інспэктар ёсьць неспачуваючы беларускай справе, бо ня хоча залічаць тых беларускіх вучыцялёў у беларускія школы, якія праслухалі свае курсы.

Звольненыя беларускія вучыцялі ні аднаму школьнаму інспэктару не даюць спакою: яны супольна з грамадзянамі пішуць просьбы аб дазволе мець беларускія школы, копіі просьбаў пасылаюць да Куратара ў Ліду і ў Варшаву. Але цяпер яны, школьныя інспэктары, прыдумалі новую хітрасьць. Яны ўсю адказнасьць за школьную справу зьвярнулі на валасныя рады, якія павінны па вёсках рабіць пастановы аб адчыненьні польскіх ці беларускіх. Гэта яны зрабілі не памылкова. Кожнаму пабочнаму чалавеку здаецца, што валасная рада, гэта ёсьць народная рада і калі яна пастановіць якую школу, значыцца, такую ўвесь народ жадае. Але запраўды гэта далёка ня так. Мусіць ні адзін вясковы селянін ня ведае, хто гэтыя рады выбіраў, у якія ўвашлі паны ды ксяндзы, і якія ня лічацца з інтарэсамі ды патрэбамі народу. Мы бачым, як гэтыя валасныя рады клапацяцца аб народзе. Калі ўзяць Забрэскую воласьць, у якой летась існавала каля 18 беларускіх школ, сёлета-ж валасная рада, не зварачаваючы ўвагі ні на якія просьбы грамадзян аб дозволе мець ім беларускія школы, станавіла толькі польскія. Апрача гэтага, самі школьныя інспэктары ўмешаваюцца ў кіраўніцтва валасных радаў. Гэта можна бачыць з факта, які адбыўся ў Забрэскай воласьці. Калі грамадзяне гэтае воласьці з вёскі Гарадзешні адмовіліся ад польскае школы і напісалі просьбу да школьнага інспэктара аб беларускай школе, дык войт не пасьведчыў іх падпісаў; сказаў, што рада па загаду Валожынскага школьнага інспэктара яму забараніла. Надоечы зьявілася яшчэ адна новая прапазыцыя польскае адміністрацыі аб школьнай палітыцы. Няма ведама з якой мэтай Лідзкі Куратар трэбуе звольненых беларускіх вучыцялёў на экзамены. Мо' ён хоча ўсіх гэтых вучыцялёў паслаць на якіясь та курсы, бо каб для таго адбываліся экзамены, каб гэтыя вучыцялі маглі дастаць польскія ці беларускія школы, дык гэта можна зрабіць і без экзаменаў. Есьць фактычныя весткі, што Валожынскі школьны інспэктар без ніякіх экзаменаў залічае ў польскія школы не выкваліфікаваных вучыцялёў. А што звольненыя вучыцялі могуць быць у беларускіх школах, аб гэтым яны маюць дакумэнты ад беларускіх школьных ўстаноў.

25.X.1921. А. Б.

да Гародзея, каб стаць на таргі. Разьвіднілася. Вывялі жаўнеры на рынак каля 150 коняй. Прышлі ахвіцэры, доктар. Сталі сартаваць коні, адабралі штук 30 каросьлівых, пракажонных, абшмуленых, кульгавых, бяззубых, з вераччакаю-мачанкаю на сьпіне, каторых можа вылячыць адзін пуд, альбо жывучая-крапучая вада.

Гэтых калек інвалідаў назначылі для хлопаў і паставілі ў адну кучу, а добрых каля 100 шт. у другую. Паны стаяць асобна ды толькі пасьміхаюцца. Для мужыкоў пяршэнства, цэняцца калекі. «Ogier gniady N. lat 12, oceniony w 25-30 tysęcy, kto więcej?» Ніхто не адгукаецца. «Хто-ж купіць гэтага дзеда, шэпчуць мужыкі, калі тут і аўчына ўся на дзірках, гэткую падлу я й на рынку у Мордуха Лысіцкага куплю за гэтыя грошы".

Чакаюць усе, што будзе з лепшымі коньмі, каторыя стаяць у другім табуне і варты на рынку 80.000-100000. „Klacza N 235, 4 lata, oceniona 30 tysęcy, kto więcej? Рынуліся нашы на гэты позыў, але ня туды дарога, ім навет падысьці і разьзявіць рота не дазволілі, жаўнеры адагналі нагайкамі. А белая костка набаўляе 1-2 тысячы і плаціць грошы. Гэтак і адбылася уцеха-дапамога і танная прадажа для нашых, а пан Мысьліцкі, З., О., Г., В. папрыводзілі па 5-6 7 і болей добрых маладых коняй. Вот і дастуціся!

Тутэйшы.

Эканамічны аддзел.

У Віленскім Саюзе.

Рэвізыйная Камісія і Управа Саюзу на супольным паседжаньні пастанавіла мець на складзе тавары, купляючы іх па такой чарзе:

I чарга: соль і нафта

II чарга: (калі будзе ў дастатку першая): цукер, селядцы, звычайнае мыла, скура падашвяная, гвазды, сярнікі, катлы.

III чарга: какао, кофэ, гарбата, цыкорый, сахарын, сьвечы, табака, папіросы, курыцельная папера, сода для піцьця, мука пшон.

VI чарга: ніткі і іголкі, шынавае зялеза, перац, мазь для ботаў, вілкі для гною, сярпы, косы і плугі.

Сэзонныя тавары, як: шмар для кол і шкло віконнае прыраўніваюцца да 1 чарады.

Мануфактуры, галянтарэі гатовай адзежы і вобую вырашана покуль што на складзе саўсім ня мець.

Канцэлярскія і вучэбныя рэчы будуць прадавацца праз кнігарню.

Нямецкія тавары.

Прыбыўшыя тавары з Нямеччыны сьведчуць аб тым, што немцы ўва столькі разоў паднімаюць цану на свае тавары, на сколькі зьмяншаецца вартасьць іх грошы. Дзеля гэтага, ня гледзячы на тое, што польская марка паднімаецца ў цане, цэны на тавары, якія да нас ідуць з Нямеччыны, не спадаюць.

Браслаўскія „каапэратары".

У Браслаўскім павеце 19 кастрычніка быў склікаваны зьезд прадстаўнікоў каапэратываў Браслаўскага павету, на які зьехалася дужа мала прадстаўнікоў ад каапэратываў. Шмат каапэратываў саўсім не паехала на зьезд, ведаючы што ўсё роўна з гэтага нічога ня будзе, бо і леташні год было шмат зьездаў для Стварэньня павятовага саюзу каапэратываў, але нічога і тады ня вышла. Апроч гэтага, бадай што ўсе каапэратывы Браслаўшчыны належаць да Віленскага Саюзу Каапэратываў і карыстаюцца з яго Аддзелу ў Дукштах і Обсі.

Старшынёй на Зьезьдзе быў пан Староста павету. З Вільні прыехаў хлопчык, які называў сябе інструктарам „Стражы Крэсовай" п. Уступскім. Гэты хлопчык угаварываў каапэратывы далучацца да арганізацыі „Стражы Крэсовай" у Вільні пад назовам: „Centrala Stowarzyszeń Rolniczo Handlowych." У канцы канцоў, пасьля дужа вялікіх абяцанак з боку і п. Старасты і п. Уступскага, вырашана адчыніць Аддзел гэтай цэнтралі у Браславе.

Цікава тое, што гэты самы зьезд „Каапэратараў" ухваліў зьвярнуцца да Польшчы аб тым, што зьезд трэбуе далучэньня Браслаўскага павету да Польшчы.

Мусіць ня вельмі верылі самі сабраныя у тое, што з гэтых усіх „Цэнтраляў" нешта выйдзе, бо наастатку мусіў п. Староста падтрымаць настрой шчодрымі абяцанкамі: кожнаму каапэратыву, што толькі далучыцца да Цэнтралі, будзе дадзена Урадам... 100 000 марак крэдыту, а самой Цэнтралі, каб толькі яна трохі склеілася,—аж 3 000.000. Але відаць Браслаўскія каапэратывы добра памятаюць прыслоўе „абяцанка—цацанка," бо як чутно, паеў у Цэнтралю ніхто плаціць ня хоча, а Староста нэрвуецца і пасылае урадовыя загады, каб плацілі.

Зьезд паўнамоцнікаў.

Урадуючая Камісія Віленскага Саюзу Каапэратываў пастанавіла склікаць агульнае сабраньне паўнамоцнікаў на дні 28, 29 і 30 сьнежня (дзекабра) гэт. году.

У Віленскім Беларускім Нацыянальным Камітэце.

У панядзелак 5 сьнежня адбылося першае пленарнае паседжаньне перавыбранага Камітэту. Было прысутных 25 нанова выбраных прадстаўнікоў віленскіх беларускіх арганізацый. Адбыліся выбары прэзыдыуму, у які ўвайшлі: старшынёю гтам. І. Красноўскі, сябрамі грам. Пракулевіч, Якубецкі і кс. А. Станкевіч. Пяты сябар прэзыдыуму яшчэ ня выбран. Чародны сход пленуму ў чацьвер 8 сьнежня ў 6 гадзін. На павесцы: давыбары прэзыдыуму і адноіны беларусаў да Віленскага Сойму.

Пасьмертныя весткі.

† З Петраграду праз Латвію прыйшло да аднаго віленскага ксяндза-беларуса падцьвярджэньне сумнай весткі аб бясчаснай сьмерці паэта Андрэя Зязюлі. Пад гэтым імем пісаў ксёндз Аляксандар Астрамовіч, здольны лірычны паэт-адраджэнец, вершы якога друкаваліся ў „Беларусе" (1913—1914 г.г.), у „Вольнай Беларусі" (1918 г.) і ў іншых беларускіх выданьнях, а таксама выхадзілі асобнымі кніжачкамі, спатыканымі крытыкаю вельмі прыхільна. Талент паэта-ксяндза аўсё болей разьвіваўся, і беларуская літэратура магла шмат чаго ад яго спадзявацца, каб сьляпая сьмерць не скасіла без пары яго кволага цела. Аб сьмерці паэта пішаць з Петраграду наш вядомы дзеяч прафэсар Шыпіла так:

„Ксёндз Астрамовіч ужо ня жыве. У I Роце (ў пракатэдральным касьцёле) адбылося жалобнае набажэнства за душу памершага. Было прамоўлена казаньне пабеларуску"...

У бліжэйшых нумарох „Бел. Вед." пастараемся даць агляд творчасьці Андрэя Зязюлі. Хто-бы ведаў яго біяграфію, просім прысылаць у рэдакцыю.

† У пятніцу 25-га лістападу г. г. пасьля цяжкай хваробы памёрла на 15-м годзе жыцьця Аляксандра Бабкіна. Нязвычайна цяжкія варункі жыцьця прымусілі яе разам з другімі таварышкамі пераехаць з Горадні ў Вільню, гдзе і спаткала яе сьмерць сярод чужых людзёў, але блізкіх да яе вучняў. Беларускі прытулак, гдзе знаходзілася нябожчыца падчас свайго жыцьця, ня мог зрабіць сьледнага пахаваньня. З гэтай прычыны, адразу пасьля весткі аб сьмерці Бабкінай, зьяўляюцца 6 падпісных лістоў і праз дзень зьбіраюцца патрэбныя на пахаваньне 14,846 марак. У аўторак 29 лістападу з раніцы, пасьля абедні і панахвіды ў Сьвята-Троіцкай царкве, пачынаецца хаўтурная працэсія на могілкі, гдзе вучыцелям Ракам-Міхайлоўскім прад апушчэньнем труны была сказана кароткая прамова да сабраўшыхся вучняў (асабліва малодшых клясаў), якіх было дужа многа. У сваёй прамове Рак-Міхайлоўскі шчыра падзякаваў усім тым, хто сваёй прысутнасьцю і складачнымі замяніў ёй бацькоў, братоў і сясьцёр. Па скончэньні прамовы словамі: „Будзь-жа табе лёгкая зямліца" Бабкіну пахавалі.

Іль-ч.

† Памёрла паня Акушка, жонка Старшыні Бацькаўскага Камітэту 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі. Рэдакцыя „Беларускіх Ведамасьцей" выказуе асіроцелай сям'і нябожчыцы сваё глыбокае засмучэньне.

ХРОНІКА.

Вучнёўскі вечар, які адбыўся ў салі Гімназіі 13-га лістапада даў чыстага даходу 40,564 маркі.

Вучні выказуюць сваё шчырае дзякуй:

Архіяпіскапу Літоўскаму і Віленскаму, уладыцы Елеуферыю, ахвяраваўшаму 1000 марак,

п. Тарашкевічу — — — — — — — 1000
пратаярэю а. М. Пліcу — — — — — 500
п. Савінскаму — — — — — — — 500
п. Сакаловай — — — — — — — 300
п. Казлоўскаму — — — — — — — 300

а так сама ўсім тым, хто зрабіў тыя ці іншыя ахвяры як грашмі, так і кніжкамі, і не адмовіў у сваёй прысутнасьці на вечары.

Грошы пойдуць на бібліятэку, вокладкі да кніжак і іншыя прылады.

Вучні.

Спаўняючы Камітэт студэнтаў-беларусаў Віленскага унівэрсытэта паведамляе сябровак і сяброў, што ад 1-га сьнежня распачаў сваю працу Сэкрэтарыят Камітэту ў кватэры Таварыства Беларускае Школы на Віленскай вуліцы № 12.

Камітэт просіць усіх сябровак і сяброў, каторыя ня былі на зборцы 27 лістападу, зьявіцца да Сэкрэтарыяту дзеля рэгістрацыі у гадзінах 3—4 штодня, апроч сьвят.

Камітэт.

◆ Надрукавана і прадаецца ў „Беларускай кнігарні" (Вільня, Завальная, 7) „Сусьветная гісторыя сярэдніх вякоў." Выданьне Беларускага Навуковага т-ва.

◆ Друкуецца ў Вільні: 1) „Сусьветная гісторыя навейшых часоў." Выданьне „Т-ва Беларускае Школы" 2) Альгэбра ч. II. 3) Арытмэтыка і 4) Фізыка.

Усе выданьні робяцца пры пасярэдніцтве „Беларускага Выдавецкага Т-ва", якое выпаўняе ўсю рэдакцыйную і тэхнічную работу.

◆ «Рідны Край» у № 266 ад 2 сьнежня паведамляе: „Да Варшавы прыбыў міністар гандлю беларускай рэспублікі, каб навязаць зносіны з Польшчаю".

◆ Выйшаў з друку „Виленскій православный календарь на 1922 годъ". Выдала рэдакцыя „Литовскихъ Епархіальныхъ Вѣдомостей". 64 старонкі ў чвертку. Цана не пастаўлена.

Календарны матар'ял надта багаты, прычым ён носіць выразны краёвы характар (сьвяты і дні, асобапачытаныя ў Літве і Беларусі, кароткае апісаньне жыцьця беларускіх сьвятых, як Кірылы Тураўскага, Афрасіньні Полацкай, Афанасія Берасьцейскага і інш.). Апроч таго, зьмешчаны ў Календары гістарычныя і сучасныя ведамасьці аб Праваслаўных Цэрквах і цікаўныя даныя аб цяперашніх беларускіх уладыках праваслаўных епархій. На жаль, аказываецца, што маем, прынамся з роду, толькі двух архірэяў-беларусаў: япіскапа Менскага і Тураўскага Мелхіседэка (у міру Міхаіл Паеўскі з Гарадзеншчыны) і япіскапа Пінскага і Навагрудскага Панталеймана (у міру Павел Ражноўскі з Літоўскай епархіі). Іншыя нашы ўладыкі—людзі нятутэйшыя, у чым можа й хаваецца прычына іх неразуменьня і да волі сьцюдзёных адносін у справе беларускага адраджэньня, хаця з другога боку маем вядомыя прыклады, як архірэі родам не-украінцы надта многа робяць для нацыянальнага украінскага адраджэньня.

Што, апроч таго, асабліва патрэбна і зьмешчана ў Календары—гэта выняткі з Рыскага трактату і канстытуцыі Польскай Рэспублікі, а таксама распараджэньне Генеральнага Камісара Усходніх Земляў і дэкрэт Галоўнакамандуючага войскамі Сярэдняе Літвы аб пытаньнях, якія трэба ведаць кожнаму праваслаўнаму беларусу нашага края.

Прыемна вабіць вока важная навіна, знайшоўшая ткі месца ў краёвых праваслаўных календарах, выдаваных царкоўнай арганізацыяй: „Віленскі Правасл. Календ. на 1922 г." месьціць у сабе вялікі і паважны артыкул: „Бѣлоруссы" (Праўда, яшчэ—не „беларусы"!) з гістарычнымі, статыстычнымі, літэратурнымі і інш. ведамасьцямі, з патрэтамі Францыска-Юрыя Скарыны, Янкі Купалы і зьнімкам з „Апостала" Ф. Скарыны, надрукаваным пабеларуску ў Вільні ў 1925 годзе. Трэба сказаць дзякуй аўтару гэтае стацьці грам. М. Кр., паказаўшаму ў яе канцы літэратуру па беларусазнаўству: несьвядомыя беларусы, прачытаўшы Календар, знойдуць забыты імі шлях, які можаць прывесьці іх на ўлоньне бацькаўшчыны. Вельмі шкода, разумеецца, што календар на расейскай мове і што ў ім не знайшлося месьцінкі хоць-бы для пары духоных вершыкаў на беларускай мове... Будзем спадзявацца, што на лета ўвідзім і гэта.

Наагул, на рэдакцыі Календара відаць умелая рука знаючага і любячага сваё дзела чалавека.

Выданьне даволі чыстае, на добрай паперы.

◆ На адным з апошніх паседжаньняў Урадуючай Камісіі Сярэдняе Літвы генеральны выбарны камісар парадзіў выдаць 4 тысячы пудоў жыта бедным жыхаром Ашмянскага павету. Прапазыцыя прынята; вынесена пастанова выдаць тры тысячы пудоў жыта. Апроч таго, пастаноўлена дазволіць бедным людзям Ашмянскага і Сьвянцянскага паветаў жыць бяз платы ў байраках, якія знаходзяцца пад загадам камісіі, зьбіраючай вайсковую дабычу. Дабычу пакуль што зьбіраць ня будуць, каб сяляне супакоіліся.

Робіцца гэта ўсё ў зьвязку з выбарамі ў Сойм.

◆ Судовая справа між п. Аляксюком і рэдактарам зачыненай расейскай газэты „Виленское Слово" п. Мейцінымі адложана з 9 сьнежня на неазначаны час.

П. Аляксюк, як вядома, вінаваціць п. Мейціна ў надрукаваньні аб ім зьняважаючых яго вестак.

◆ За колькі дзён выйдуць з друку ў Вільні 2 беларускіх календары на 1922 год.

◆ Амэрыканскай місыяй евангелікаў ахвяравана на беларускі прытулак 150.000 польск. мар.

◆ У Вільню прыехаў камісар Лігі Народаў палк. Шардыні і доўга радзіўся з п. Мэйштовічам.

Як мы чулі, да Шардыні мелася схадзіць дэлегацыя беларусаў.

◆ Польскае газэтнае бюро, падаўшае весткі аб „небясьпечнай беларускай агітацыі" ў Барунах, паведамляе, што 11 сьнежня адбудзецца ў Вільні беларускі зьезд, называючы гэтак маючы быць зьезд польскіх агентаў з „Краёвай Сувязі:" Зьезд будзе выясьняць адносіны „беларускіх кругоў" (!!) да выбараў.

◆ У памяшканьні Беларускага Музыкальна-Драматычнага Гуртка, Біскупская 12, у суботу 10 сьнежня ідзе: „На папасе" Я. Купалы, „За пасагам" кам. Далецкіх і дывэртысмэнт.

Скокі на салі да 4 г. р.

У № 29 газэты „Jednaść", які выйшаў у суботу 3 сьнежня г. г., зьявілася гэткая заметка пад назовам: „Лоўля «бальшавікоў»:

„У Радашкавічах сядзіць арыштававаны вучыцель-беларус Лістапад, які выехаў у Сычавічы ад Камітэту Краёвай сувязі ў справе адкрыцьця тамака беларускай школы. Арэшт гэты выклікае ў нас вялікае зьдзіўленьне. Адпаведныя захады зроблены".

У той-жа дзень прыйшло па пошце ў рэдакцыю „Беларускага Звону" пісьмо на расейскай мове, за подпісам нейкага Івана Біча, у якім паведамлялася, што арыштаваны раённым начальнікам беларускі вучыцель Лістапад забіт па неасьцярожнасьці праважатым па дарозе з Радашкавіч у Вялейку, за 2 вярсты ад Аляхновіч, што цела забітага вучыцеля ляжыць яшчэ ў Сычавічах, горка аплаканае вучнямі...

Тымчасам, у тую-ж суботу зьяўляецца ў Вільні сам „нябожчык" Лістапад.

Мы вымагаем, каб справа гэтая была высьветлена. Ня можна дараваць, каб нехта дзеля сваіх падазроных мэтаў правацыраваў грамадзянства, сьвядома выклікаючы яго на фальшывы і шкодны для нацыянальнай справы гвалт.

А найгорш тое, што Сычавічы, мабыць, так і застануцца бяз школы, бо польскую вучыцельку там не прынялі, а беларускі вучыцель з паперамі ад „Краёвай Сувязі" трапіў у „нябожчыкі".

Ад сваіх людзей з раёну Сычавіч мы даведаліс, што Лістапад ня быў арыштаваны...

Да ведама вучыцялёў.

Нас просяць паведаміць у газэце, што ад вучыцялёў, якія маюць ехаць на курсы ў Кракаў, будуць адбіраць падпіску ў тым, што яны пасьля курсаў павінны застацца вучыцялямі ў Польшчы.

☞ У № 7 „Бел. Вед." у вершы „У чайцы на вадзе жыцьця..!", 12-ты радок, убілася надта прыкрая друкарская памылка. Надрукована: «І да той зямлі высьнёнай там народаў». Павінна было быць: «І да той зямлі высьненай вольных там народаў». Паважанага аўтора і перакладчыка просім прабачыць нам недагляд.

Да ведама латвійскіх беларусаў.

◆ Міністэрства Прасьветы Дэпартамэнт меншасьцяў. Беларускі Аддзел. 3 лістапада 1921 г. № 30. Рыга. Мікалаеўская вул. № 36-а.

29 мінулага кастрычніка пры Міністэрстве Прасьветы адчыніўся і пачаў працу Беларускі Аддзел.

Паведамляючы аб гэтым грамадзянства і Установы, ён просіць па ўсім пытаньням беларускае школы і прасьветы зварочвацца па адрэсу: Беларускі Аддзел Міністэрства Прасьветы Рыга, Мікалаеўская вуліца, № 36-а, а за школьнымі падручнікамі, беларускай літэратурай і газэтамі па адрэсу:

Беларускае Таварыства «Бацькаўшчына». Рыга, Мікалаеўская вуліца № 20, кв. 1.

Кіраўнік Аддзелу С. Сахараў.
Дзелавод Я. Шчорс.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Грамадзянін Рэдактар!

У інтэрэсах праўды прашу надрукаваць ніжэйпаданае:

Адказны рэдактар „Кгупісу" В. Грыневіч, на № 31 гэтай газэты, зрокся ўсіх рэдактарскіх на яе праў і абавязкаў. Пасьля гэтага рэдактарска-выдавецкая супалка „Кгупісу" запрасіла на адказнага рэдактара У. Знамяроўскага, які згадзіўся і на яго імя падаў просьбу ў „Прасовы Аддзел" аб дазволе быць яму рэдактарам „Кгупісу". У так званай „Сярэдняй Ліцьве" істнуе закон, паводле якога прашэльніку аб дазволе рэдагаваць газэту у працягу трох дзён або даецца дазвол, або адмаўляецца. Але да „Кгупісу" гэтага закону тасаваць нешта не захацелі. Грам. У. Знамяроўскаму на яго просьбу ў працягу больш як тры дні на паперы „Выдзял Прасовы" не адказаў нічога, а на словах дазволіў выдаваць газэту. Чародны № 32 „Кгупісу" з подпісам грам. Знамяроўскага вышаў у сьвет. „Выдзел Прасовы" нешта з тыдзень маўчаў. Пасьля заклікаў рэдактара і заявіў яму, што „Кгупісu" штрафуецца на 10,000 п. м., за тое, што яна паказалася на сьвет не дачакаўшы пісьменнага дазволу з „Выдзялу Прасы", і што часова „Кгупісу" выпушчаць нельга. Пасьля некалькіх дзён „Выдзел Прасы" грам. Знамяроўскаму, які дамагаўся дазволу на паперы, заявіў, што яму Знамяроўскаму, выдаваць газэту не дазволіцца, а што нехта іншы някай падасьць нанова просьбу і яму дасцца дазвол на выданьне і рэдагаваньне „Кгупісу". Зрабілі гэта. Адказ адтрымалі адмоўны. Прашэльніку новага дазволу на „Кгупісu" грам. Рагачу заявілі, што раз В. Грыневіч зрокся сваіх праў па Кгупісu", дык яна больш выходзіць ня можа. А калі грам. Рагач заявіў, што гэта ёсьць новая просьба на новую газэту „Кгупісu", тады яму сказалі, што такога кірунку, у якім пісалася „Кгупіса", цярпець ня можа і аб дазволе ўзноў выдаваць „Кгупісu" няма і мовы.

З усяго гэтага робім вывад, што, ня гледзячы на заяву „Прасоваго Выдзялу", зьмешчаную ў 11 нумары „Беларускіх Ведамасьцяў", што „Кгупіса" не закрыта, „Кгупіса" усё-ж такі закрыта.

Дык вось блізу пяць гадоў з перарывамі верна служыла „Кгупіса" роднаму краю, роднаму брату селяніну і знашла сабе мучаніцкую сьмерць у роднай Вільні ад улады „Сярэдняй Літвы" на парозе выбараў у Віленскі Сойм, відаць, як знак найвышэйшай свабоды.

М. Дубавік,
супрацоўнік „Кгупісу".

Курс на грошы ў Вільні.

7 сьнежня 1921 г.

Нямецкія маркі (1000)	17,25
Осты (1000)	16,10
Даляры	3475
10 руб. золатам	15000

Рэдактар і выдавец Максім Гарэцкі

Друкарня „Друк", Субач 2.